ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА КУЛЬТУРЫ
“ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СЕТКА АСІПОВІЦКАГА РАЁНА”

# БАЯВЫ ПОДЗІГ
## вялікай годнасці

### бібліяграфічны нарыс
### пра Ф.А. Крыловіча



Зорная, цёплая, ліпеньская ноч сорак трэцяга. Над горадам Асіповічы глыбокая і трывожная цішыня. На вуліцах – ні душы, вокны дамоў наглуха заштораныя. Як быццам усё вымерла. Толькі на чыгуначнай станцыі рэдка падаюць сігналы паравозы, адасоблена паблісківаюць семафоры, прапускаючы ваенныя эшалоны.

У гэты час на Курскай дузе працягвалася адна з самых кровапралітных бітваў другой сусветнай вайны. І ў гэтыя цяжкія для нашай радзімы дні фронту патрэбна была дапамога з боку партызан і падпольшчыкаў, якія вялі ў тыле ворага барацьбу з гітлераўскімі захопнікамі.

Менавіта ў гэты час была распрацавана і старанна рыхтавалася аперацыя, што ўвайшла ў гісторыю пад назвай «Рэйкавая вайна». Яна прадугледжвала адначасовы ўдар ўсіх партызанскіх сіл па варожых чыгунках часова акупаванай фашыстамі тэрыторыі краіны. План аперацыі быў распрацаваны Цэнтральным штабам партызанскага руху і зацверджаны Стаўкай Вярхоўнага Галоўнакамандавання.

Фашысцкія захопнікі абрынулі на нашу краіну каласальную ваенную сілу. Цаной велізарных страт ім атрымалася акупаваць шэраг заходніх раёнаў краіны. Але лінія фронту не падзяліла савецкіх людзей. Адыходзячай на ўсход калатнечы ўторылі выбухі і стрэлы ў варожым тыле. Гітлераўцы так і не сталі гаспадарамі на нашай зямлі. Заклік Камуністычнай партыі – ператварыць вайну супраць фашызму ў вайну святую, усенародную – быў успрыняты усім насельніцтвам Беларусі як загад Радзімы. За зброю ўзяліся мужчыны, жанчыны, старыя, дзеці ...

Барацьбой савецкага народа ў тыле ворага кіравала камуністычная партыя. Яна арганізавала і ўзначаліла яе, надала гэтай барацьбе мэтанакіраваны характар. Толькі на акупаванай тэрыторыі Беларусі дзейнічалі 10 падпольных абкамаў, 193 гаркама, межрайкома і райкама партыі, звыш 1200 пярвічных партыйных арганізацый у партызанскіх атрадах, 184 тэрытарыяльныя нелегальныя партарганізацыі, у якіх налічвалася больш як 35 тысяч камуністаў.

Партызаны і падпольшчыкі не давалі ворагу спакою ні днём, ні ноччу. Асабліва эфектыўнымі былі іх дыверсіі на камунікацыях. За гады барацьбы з фашысцкімі акупантамі патрыёты Беларусі

падарвалі 11128 варожых эшалонаў і 34 бронецягнікі, знішчылі больш 18000 аўтамашын, падбілі 1355 танкаў і бронемашын, 438 артылерыйскія гарматы, спалілі 939 розных вайсковых складоў, разграмілі 948 штабоў і гарнізонаў, мноства чыгуначных станцый і вузлоў сувязі ворага. Дыверсійная дзейнасць, як найбольш эфектыўны спосаб барацьбы з акупантамі, займала адно з галоўных месцаў у тактыцы партызан і падпольшчыкаў. У 1943–1944 гадах многія падпольныя арганізацыі сталі атрымліваць ад партызан спецыяльныя магнітныя міны, невялікія па памеры і зручныя ў абыходжанні. Дзякуючы гэтаму падпольшчыкі Беларусі змаглі нанесці шэраг новых магутных удараў па аб’ектах акупантаў.

Адной з самых яркіх дыверсій, учыненых у гады Вялікай Айчыннай вайны, была дыверсія на станцыі Асіповічы ў ноч з 29 на 30 ліпеня 1943 года. Непасрэдным выканаўцам яе стаў асіповіцкі падпольшчык, камсамолец Фёдар Крыловіч.



Ф. А. Крыловіч нарадзіўся ў 1916 годзе ў Мінску ў сям’і рабочага-чыгуначніка. Бацька яго, Андрэй Андрэевіч да рэвалюцыі і пасля яе працаваў кандуктарам. Дзіцячыя і юнацкія гады Фёдара прайшлі ў Асіповічах. Тут ён скончыў сямігодку. Паступіў у Віцебскі электратэхнікум, аднак вучобу прыйшлося перапыніць па прычыне матэрыяльных цяжкасцей. Каб дапамагчы сям’і, працаваў на дзве стаўкі:электрыкам Асіповіцкай чыгуначнай электрастанцыі і адначасова памочнікам упаўнаважанага па справах фізкультуры і спорту ў горадзе.

У 1937 годзе Фёдар Крыловіч быў прызваны на службу ў Чырвоную Армію, трапіў у акруговую школу сувязістаў ва Ульянаўску. Стаў сяржантам. Частка, у якой ён служыў, прыняла ўдзел у баях на рацэ Халхін-Гол, у далёкай Манголіі. У самы разгар баёў малодшы сяржант Фёдар Крыловіч падаў заяву ў камсамол. «Хачу ісці ў бой камсамольцам», – пісаў ён у заяве. Затым былі баі на савецкай мяжы.

Пасля заканчэння ваенных дзеянняў дэмабілізаваны воін вярнуўся ў родныя мясціны і зноў стаў працаваць на Асіповіцкай чыгуначнай электрастанцыі.

«– Фёдара ведалі і любілі ў горадзе. Ён быў высокага росту, шыракаплечы, ён быў незвычайна рухомым, таварыскім і ў той жа час смелым і рашучым хлопцам. У вайсковай гімнасцёрцы, падцягнуты і стройны, ён мог пасупернічаць з любым ў вясёлым танцы на прадваеннай вечарыне. Усім гэтым ён прыцягваў да сябе моладзь. Маладзейшыя імкнуліся браць з яго прыклад. Для нас слова Фёдара было законам» – так узгадвае пра свайго сябра былы асіповіцкі падпольшчык Леанід Верашчагін.

Гісторый розных пра Фёдара ўспаміналі нямала. Задумала, да прыкладу, чыгуначнае начальства ўмацаваць да Першамаю на трубе электрастанцыі чырвоны сцяг. Хто адважыцца палезці на верхатуру? Выклікаліся многія, але дабраўся адзін Крыловіч. І не проста вывесіў сцяг, а ў дадатак на вачах ва ўсяго горада выканаў там на трубе нейкі гімнастычны трук.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Фёдар адным з першых прыйшоў у ваенкамат. Але яму адмовілі: чыгуначнікі браняваліся ад прызыву. Не атрымалася выбрацца з горада і з часцямі, адступаючай Чырвонай Арміі. Прыйшлі гітлераўцы. Хутка «новы парадак» акупацыйных уладаў паказаў сябе ў Асіповічах расстрэламі мірных жыхароў. На сценах дамоў застракацелі фашысцкія плакаты, загады, распараджэнні: «Усім працоўным з’явіцца на свае месцы. За невыкананне загаду – смерць!».

...У дэпо Фёдар Крыловіч сустрэў былых сяброў. У кожнага было адно пытанне: «Як там, на фронце? Дзе нашы?».

Аднойчы хтосьці сунуў у руку лістоўку. Крыловіч паспешліва прабег яе вачыма. Гэта былі вытрымкі з прамовы Сталіна  ад 3 ліпеня 1941 года. «Прачытай і перадай іншаму», – мільгануў апошні радок.



ПРОЧИТАЙ И ПЕРЕДАЙ ДРУГОМУ

ЖЕЛЕЗНОДОРОЖНИК БЕЛОРУССИИ!

Оставшись в тылу у немцев, продолжай борьбу с заклятым врагом. Если ты не ушел в партизанский отряд, если немцы заставили тебя работать, всегда и везде помни о священном долге патриота—НА КАЖДОМ ШАГУ МСТИ НЕМЕЦКИМ ОККУПАНТАМ. Ты знаешь свое дело, свою станцию, свой участок пути, систему связи, сигнализации. Ты знаешь слабое, уязвимое место своей службы. Используй это уязвимое место, чтобы парализовать работу службы, участка и тем самым сорвать работу по перевозкам немецких войск, оружия, боеприпасов, продовольствия. Этим самым ты поможешь своему народу, Красной Армии в священной борьбе против озверелых немцев.

Перерезать врагу жилы — сделать непригодными для врага железные дороги, воспрепятствовать фашистам ездить по белорусским железным дорогам — такова задача.

РОДИНА ТРЕБУЕТ ОТ ТЕБЯ:

ДЕЛАЙ ВСЕ, ЧТО МОЖЕШЬ, ЧТО В ТВОИХ СИЛАХ, ЧТОБЫ ЗАТОРМОЗИТЬ, СОРВАТЬ ДВИЖЕНИЕ ФАШИСТСКИХ ЭШЕЛОНОВ: ОРГАНИЗУЙ КРУШЕНИЯ ПОЕЗДОВ, ПОРЧУ ПАРОВОЗОВ, ВАГОНОВ, ПУТИ; ВЫВОДИ ИЗ СТРОЯ СИСТЕМУ СВЯЗИ И СИГНАЛИЗАЦИИ; САБОТИРУЙ ВСЕ НЕМЕЦКИЕ МЕРОПРИЯТИЯ И РАБОТУ НА НЕМЦЕВ— НА РЕМОНТЕ ПОДВИЖНОГО СОСТАВА, ПУТЕЙ И ОБОРУДОВАНИЯ, НА ПОГРУЗКЕ И ВЫГРУЗКЕ.

Товарищ, помни! ...

Посмотри вокруг. ...

Прислушайся. ...

Сделай вывод. ... Этим ты ускоришь ОСВОБОЖДЕНИЕ РОДНОЙ БЕЛОРУССКОЙ ЗЕМЛИ от ига немцев-зверей.

СМЕРТЬ НЕМЕЦКИМ ОККУПАНТАМ!

Издание ЦК КП(б) Белоруссии, 1942 год.

Дадому Фёдар не ішоў, а як быццам ляцеў на крылах – гэтак спяшаўся падзяліцца навіной з бацькам. «Значыць, не ўсё страчана, значыць, можна і тут, у тыле ворага, дапамагаць Радзіме» – не пакідала яго думка.

Андрэю Андрэевічу Крыловічу, бацьку Фёдара, пераваліла тады ўжо за шэсцьдзесят. Ён быў чалавекам з багатым жыццёвым вопытам і моцным ідэйным перакананнем. Разам з рабочымі Лібава-Роменскай чыгункі ён прайшоў скрозь завірухі трох рэвалюцый, набыў вопыт падпольнай барацьбы ў гады грамадзянскай вайны.

Выслухаўшы сына, Андрэй Андрэевіч спакойным голасам астудзіў яго запал:

– Не гарачыся, Федзя... Немца мы знаем. Не ўпершыню нам з ім ваяваць. Кайзера не баяліся, і яфрэйтар–фюрар нам не страшны. Трэба добра агледзецца, людзей надзейных знайсці, а потым пачаць барацьбу. Бо аднаму фашысты хутка шыю скруцяць...

Бацька параіў сыну падтрымліваць цесную сувязь з рабочымі-чыгуначнікамі, каб ведаць усе навіны.

Фёдар уключыўся ў працу Асіповіцкага партыйна-камсамольскага падполля. Ён узначаліў падпольную камсамольскую групу на чыгуначным вузле. Пачынаючы з ліпеня 1941 года Ф. А. Крыловіч падтрымліваў цесную сувязь з партызанскім атрадам №210, якім камандаваў былы старшыня Асіповіцкага райвыканкама М. П. Каралёў. Пасля прыходу ў верасні 1942 года ў Асіповіцкі раён 752-га партызанскага атрада пад камандаваннем В. І. Ліўенцава, на базе якога пазней была

арганізавана Бабруйская партызанская брыгада, Ф. А. Крыловіч устанавіў з гэтым атрадам сувязь і пачаў выконваць яго заданні. Непасрэдная сувязь з Крыловічам падтрымлівалася цераз камандзіра групы дальняй разведкі П. І. Трацэўскага, а пасля яго сыходу на працу рэдактарам падпольнай асіповіцкай газеты – праз камандзіра групы І. С. Пракаповіча.

Група Ф. А. Крыловіча праводзіла ў горадзе вялікую работу. Падпольшчыкі прымалі па радыё зводкі Саўінфармбюро, распаўсюджвалі лістоўкі, газеты... Сістэматычна паведамлялі партызанам каштоўныя дадзеныя, забяспечвалі іх медыкаментамі, паперай і іншымі матэрыяламі, накіроўвалі ў партызанскія атрады папаўненне.

Пасля прыбыцця ўвесну 1943 года ў 1-ю Бабруйскую партызанскую брыгаду ўпаўнаважанага ЦК ЛКСМБ, сакратара Магілёўскага падпольнага абкама ЛКСМБ П. Ф. Валожына, камандаванне брыгады перадало яму сувязі з Асіповіцкімі камсамольцамі-падпольшчыкамі. П. Ф. Валожын даручыў Крыловічу стварыць у горадзе падпольную камсамольскую арганізацыю.

У архіве захоўваецца ліст П. Ф. Валожына сакратару ЦК ЛКСМБ К. Т. Мазураву, напісанае 2 ліпеня 1943 года: «Пра падполле. Меў спатканне. Падабраўся выдатны хлопец. Ён у мяне ўпаўнаважаны па г. Асіповічы – Крыловіч Ф. А.... Ён па маім даручэнні арганізаваў 9 камсамольскіх арганізацый па 3–4 чалавекі... Гэты Крыловіч Федзя... энергічны і ініцыятыўны, добры выканавец. Вось што ён зрабіў за сваё знаходжанне ў Асіповічах: акрамя гэтых 9 арганізацый, у яго ёсць яшчэ 11 чалавек дыверсантаў і 5 распаўсюджвальнікаў літаратуры. Склад – камсамольцы і моладзь. Адзін з адным яны не звязаныя. Гэтая група знішчыла за сваё існаванне 21 цыстэрну з гаручым, 13 платформаў з гаручым. Выведзена са строю 38 электраматораў, дызель электрастанцыі выведзены са строю на 6 месяцаў..., пераправіў у партызанскія атрады 52 чалавекі моладзі. Хлопец добра ведае працу падполля, канспірацыі. Паставіў перад ім шэраг новых задач і асноўнае – актывізацыя дзейнняў створаных арганізацыяй».

Падпольшчыкі адчувалі вялікую патрэбу ў магнітных мінах, ліст заканчаецца пераканаўчай просьбай выслаць міны і тол. Праз сувязных Л. Г. Курганскую (загінула ў 1943 годзе)  і А.К.Пармон і іншых Фёдару Крыловічу перадаваліся тол, магнітныя міны, якія ён сам або іншыя члены групы ставілі на нямецкія склады, якія сыходзяць са станцыі. Да лета 1943 года ўсе магнітныя міны былі выкарыстаны, і Фёдару Крыловічу перадалі праз Мікалая Патоцкага і Алену Пармон яшчэ дзве магнітныя міны.


Выписка
из рапорта начальника разведки отряда „Храбрецы" Бабиевского Н.П. в НКГБ БССР.

Командованием отряда „Храбрецы" была разработана комбинация по взрыву эшелонов противника на ст. Осиповичи. Двум членам подпольной комсомольской организации, действующей на этой станции для этой цели были переданы магнитные мины. Мины были переданы на месте командиром группы гвардии лейтенантом тов. Бочерикововым и заместителем по политчасти этой группы тов. Шевчуком. В город мины отнес член подпольной организации Потоцкий Николай Иванович.

30 июля 1943 года в 0 часов 05 минут второй член подпольной комсомольской организации наш связной Крылович Федор Андреевич, работающий в депо Могилевского парка на ст. Осиповичи, поставил две магнитные мины к цистернам эшелона с горючим - одну в голове, а вторую в хвосте эшелона. Рядом с этим эшелоном стояли железнодорожные составы: с горючим, авиабомбами и танками, а один с продовольствием.

В 3 часа ночи поставленные Крыловичем мины сработали. Первая в голове эшелона, а вторая позднее через 15-20 минут, вследствие чего возник пожар, перекинувшийся на соседние эшелоны. Начали рваться цистерны с бензином, авиабомбы,



Последующей проверкой установлено, что в результате данной диверсии уничтожено: два эшелона в составе 67 вагонов с авиабомбами и боеприпасами, 5 танков типа „Тигр", три танка „Л-10", 10 бронемашин, 5 паровозов, 8 цистерн с бензином и 20 вагонов с авиамаслом, 12 вагонов с продовольствием, убито и ранено до 135 человек железнодорожной охраны противника. Кроме этого выведен из строя угольный склад, уничтожена крановая подача угля, сгорели деревянные сооружения лагеря военнопленных и 17 жилых домов. Пострадали станционные сооружения и телефонно-телеграфная связь.

Выписка верна:
Сотрудник КГБ БССР
(Жур)

Основание: Архив КГБ БССР, дело 94, том 1, ч. 2-я, стр. 379.

25 января 1979 года.

...Усіх станцыйных электрыкаў, сярод якіх быў і Крыловіч, немцы аб'ядналі ў брыгаду. Ноччу дзяжурыў адзін чалавек. Перад начным дзяжурствам ён днём на працу не выходзіў. Фёдар гэты час выкарыстаў для выхаду на сувязь з партызанамі.

Звычайна эшалоны з палівам на станцыі не затрымліваліся, іх ці адганялі ў далёкія тупікі, або спяшаліся адправіць далей па прызначэнню. На гэты ж раз, насуперак праславутай нямецкай педантычнасці ды і проста здароваму сэнсу, выбухованебяспечны эшалон перавялі ў так званы Паўночны парк, дзе ўжо знаходзіліся два саставы з боепрыпасамі і адзін – ваеннай тэхнікай.

Дыверсія Крыловіча стала свайго роду сігнальнай ракетай да пачаўшайся неўзабаве, у ноч на 3 жніўня, «рэйкавай вайне», якая



прывяла да шматдзённага паралічу чыгуначных магістраляў на велізарных прасторах нямецкага тылу. Але гэта – яшчэ наперадзе…

З 29 на 30 ліпеня Фёдар Крыловіч дзяжурыў у начную змену. Міны былі схаваны на дне скрыні з інструментамі. Ужо пачынала цямнець, калі Фёдар убачыў, што на станцыю прыбыў эшалон з гаручым. «Гэты, відавочна, не затрымаецца. Трэба рызыкнуць», – мільганула думка. Падпольшчыкі часцей за ўсё імкнуліся ставіць міны на праходзячыя цягнікі. Выбухі адбываліся далёка за станцыяй, на перагоне, што збівала з панталыку гітлераўцаў.

Са шляху сталі клікаць электрыка. Зламаўся святлафор. Гучна наракаючы на «вечныя непаладкі», Фёдар накіраваўся да яго. Суправаджаючы Крыловіча немец-ахоўнік спыніўся каля часавога. Пра нешта загаварыў з ім. Фёдар пайшоў далей. Выбраўшы зручны момант, прымацаваў міну да цыстэрны ў галаве саставу.

Змена скончылася ў гадзіну ночы. Над станцыяй цішыня. Пасля таго, як Фёдар прымацаваў другую міну да цыстэрны ў хвасце эшалона, састаў павольна рушыў з месца, але праехаўшы метраў трыста, далей не пайшоў – спыніўся на шляхах магілёўскага парка. Пасля Крыловіч даведаўся, што недзе наперадзе, пад Жлобінам, партызаны ў гэты час ўзарвалі чыгуначнае палатно…

Павольна ішлі хвіліны, стрэлка набліжалася да дзвюх гадзін ночы, можа выявілі міны? Яшчэ раз глянуў на гадзіннік …

Командиру десантной группы „Игорю"
от Крыловича Федора Андреевича.

## Рапорт.

25 июля 1943 года я связался с десантниками Шевчуком С.С. и Бочериковым А. через уполномоченного ВЛКСМ Волошина Павла. Мне были вручены магнитные мины Шевчуком и Бочериковым для совершения диверсии на ст. Осиповичи. Одновременно мне была оказана и денежная помощь.

30.VII в 05 минут мины мною были заложены в состав с горючим. Одна мина в голове состава, а вторая в хвосте. В три часа произошел взрыв в голове состава, а через 25 минут взорвалась вторая мина. Поезд с горючим стоял рядом с двумя составами с боеприпасами и один состав с техникой.

В результате взрыва уничтожено:
8 цистерн авиамасла, 23-25 цистерн с бензином, 65 вагонов с боеприпасами,
5 танков „Тигр", 3 танка „Л-20"
10 бронемашин, 12 вагонов с продуктами
5 паровозов, кран для подачи угля, угольный склад. Сгорело 9 гражданских домов и лагерь военнопленных. Повреждены станционные сооружения. Сведения мною уточнены. Сам я, работая в депо на ст. Осиповичи, ранее был связан с бригадой Ливенцева.


-2-

После совершенной диверсии начались массовые репрессии, в связи с чем я вынужден был уйти в бригаду Ливенцева, поскольку давал подписку о переходе к ним, если у меня не будет возможности работать в подполье.

Подпись Крылович

19.VIII.43г.

Копия верна:
Сотрудник КГБ БССР
[подпись] (Шур)
26 января 1979 года.

Основание: архив КГБ БССР,
д. 94, т. 2, стр. 240

Першы выбух Фёдар хутчэй адчуў, чым пачуў. На станцыі завыла сірэна, ўспыхнулі пражэктары. Агонь імкліва распаўзаўся ў бокі. Ад нагрэву выбухнула адна, а потым адразу некалькі бочак з бензінам. Затым рванулі цыстэрны. Як свечка ўспыхнуў суседні састаў – пачалі рвацца авіябомбы і снарады. Спрабуючы расцягнуць састаў, немцы адчапілі апошнюю цыстэрну, але толькі ссунулі яе з месца, раздаўся выбух. Чатыры воінскіх эшалоны апынуліся перакрытымі ў магілёўскім парку. І гэта – у Асіповічах, нашпігаваных нямецкімі часткамі, паліцэйскімі падраздзяленнямі, службамі забеспячэння вермахта і, вядома, спецслужбамі, якія імкнуліся вычысціць горад ад найменшай крамолы. Можаце ўявіць, як усё гэта шуганула ў прызначаны час. Відавочцы распавядалі, што Асіповічы не адну гадзіну трэсла як пры землятрусе, бензін фантанаваў агністымі бруямі, а

дэтанаваныя снарады рваліся як на передавой. Тыя ж, што не разарваліся, гітлераўцы яшчэ некалькі дзён збіралі па горадзе.

Можна толькі ўявіць, з якім пачуццём дзяжурны афіцэр аператыўнага аддзела 203-й ахоўнай дывізіі атрымаўшы паведамленне аб дыверсіі, рабіў запіс у дзённіку баявых дзеянняў дывізіі: «1943/07/30 г. Каля 2-х гадзін на ст. Асіповічы на чыгуначным саставе з гаручым выбухнула магнітная міна. У выніку гэтага згарэла 29 цыстэрнаў з гаручым, 60 вагонаў з боепрыпасамі і састаў з аўтамашынамі. Па ўсім мястэчку раскіданыя боепрыпасы. Тэрмінова запатрабаваны піратэхнікі для ліквідацыі паўсюль раскіданых снарадаў. Па дадзеных 550-й палявой камендатуры, страты склалі 3–4 салдата забітымі, 27 салдат і 6 чыгуначнікаў параненымі».





Вось дадзеныя з партызанскага рапарту:



Уполномоченному Центрального штаба партизанского движения тов. Васильеву

Оперативная сводка Бобруйской партизанской бригады за период с 30 июля по 12 сентября 1943 года.

Карта 1:100 000

БЕЛОРУССКИЙ ШТАБ ПАРТИЗАНСКОГО ДВИЖЕНИЯ
Вх. № 3089
13-10 1943 г.

1. 752 партизанский отряд

30.7.43 г. в 2 ч. 30 м. на ст. Осиповичи (Могилевский напр.) связной отряда - Крылович Ф. И. по заданию командования двумя магнитными минами произвел диверсию, в результате которой сожжено 4 вражеских эшелона. От пожара и взрыва уничтожено: 2 паровоза, 8 цистерн с авиамаслом, 23 вагона с бензином (по 20 бочек и более в вагоне), 30 вагонов со снарядами, 35 вагонов с авиабомбами, со снарядами и минами, 15 вагонов с продуктами, 5 платформ с 58 т. танками типа „Тигр", 5 платформ с 3 легкими танками „Л-10", 7 платформ с бронемашинами, кран для подачи угля, повреждено 3 паровоза, разрушен склад с углем, выведен из строя ж.-д. путь Могилевского парка, ранено 15 немцев. Пожар и взрывы огромной силы продолжались до 12 час. 30.7.43. От пожара сгорело 9 жилых домов и 1 концентрационный лагерь (заключенные разбежались). На улицах города найдены неразорвавшиеся снаряды с немецкой упаковкой: „15 июля 1943 года".

31.7.43 г. Диверсионные группы С.-Т. на ж.д. Минск-Бобруйск в районе сев. зап. 1,5 км д. Огиново подорвали вражеский эшелон с углем, идущий на фронт. В результате взрыва уничтожено: 1 паровоз, 12 вагонов, 2 платформы.

6.8.43 г. Бригадой в составе двух партизанских отрядов (752, 753) на ж.д. Минск-Бобруйск в р-не д. Старицы ст. [illegible] проведена операция по приказу № 0012 в трудных условиях под беспрерывным пулеметным и минометным огнем против [illegible]

Использовано в сводку [illegible] 23.10.43.

А вось артыкул з газеты «Бабруйскі партызан» за 20 жніўня 1943 года:



## Месть советских патриотов

С осени 1942 г. в гор. N начала свою работу подпольная диверсионная группа советских патриотов—железнодорожников. Мужественных сынов советской родины не могли заставить немецкие псы работать на себя. Каждый из диверсантов старался как можно больше навредить незванным гостям города.

Командир группы тов. Ф. был связан с партизанами из бригады Л., получал от них задания, мины. Група за время своей работы повредила три паровоза, на 6 месяцев вывела из строя дизель электростанции, систематически мешала продвижению эшелонов на фронт.

В ночь на 30 июля 1943 г. смелые диверсанты нанесли большой урон врагу. Достав мины от т. В., мужественные патриоты поставили их с двух концов эшелона, нагруженного бензином и авиамаслом. В половине второго ночи город был потрясен оглушительными взрывами. Пожар охватил вагонный парк. Ошеломленные немцы начали прятаться в огородах. Они думали, что самолеты бомбят город. Пламя пожара распространилось на рядом стоявшие эшелоны. Начали рваться мины, бомбы, снаряды.

В результате взрыва вышел из строя вагонный парк, угольный склад, кран для подачи угля. Огнем уничтожены: один эшелон с бензином и авиамаслом, а также командой в 10-12 человек, два эшелона со снарядами, минами и авиабомбами, один эшелон с военной техникой и продовольствием. В последнем эшелоне сгорело 5 танков типа „Тигр", 3 танка Л—10, 7 бронемашин. От всех четырех эшелонов не осталось и следа. Кроме того, ранено 15 немцев-железнодорожников.

Так советские патриоты платят немцам за поругание нашей родины, за смерть и слезы наших матерей, жен и детей.

П.

Былы афіцэр генеральнага штаба сухапутных сіл Германіі Эйке Міддэльдорф у кнізе «Тактыка ў рускай кампаніі» напіша праз некалькі гадоў пасля вайны: «Буйнога поспеху дабіліся партызаны таксама ў ліпені 1943 года, калі імі на станцыі Асіповічы быў знішчаны эшалон з гаруча-змазачнымі матэрыяламі, два эшалоны з боепрыпасамі і надзвычай каштоўны эшалон з танкамі «Тыгр».

Цяжка абвінаваціць гітлераўскага ваяку ў тым, што ён перабольшвае вынікі дыверсіі. Эшалон з танкамі быў сапраўды каштоўным. У Асіповічах было знішчана звыш 20 танкаў, гэта амаль столькі колькі выпускала танкавая прамысловасць у Германіі ў пачатку 1943 гады за адзін месяц. На танкі «Тыгр» ў Курскай бітве Гітлер ускладаў асаблівыя надзеі. Вядома, што пачатак аперацыі «Цытадэль» некалькі разоў адкладваўся з-за неўкамплектаванасці танкавых частак «Тыграмі» і «Пантэра».

У сродкі масавай інфармацыі трапілі розныя паведамленні аб праведзенай Крыловічам самай буйной дыверсіі Другой сусветнай вайны. Былы камандзір 1-й Бабруйскай партызанскай брыгады,

Герой Савецкага Саюза В. Лівенцаў, былы сакратар Магілёўскага падпольнага абкама ЛКСМ, упаўнаважаны ЦК ЛКСМБ па зоне Асіповічы–Бабруйск В. Валожын, былая падпольшчыца г. Асіповічы А. Пармон (Перавозчыкава) звярнуліся да Сакратара ЦК КП Беларусі таварыша Кузьміна А. Т. з лістом аб няправільным асвятленні ў друку дыверсійнай аперацыі, праведзенай камсамольцамі-падпольшчыкамі ў ноч на 29 на 30 ліпеня 1943 на ст. Асіповічы:



СЕКРЕТАРЮ ЦК КП БЕЛОРУССИИ

товарищу КУЗЬМИНУ А.Т.

Копия: ИНСТИТУТУ ИСТОРИИ ПАРТИИ ПРИ ЦК КП БЕЛОРУССИИ

О неправильном освещении в печати диверсионной операции, проведенной комсомольцами-подпольщиками в ночь с 29 на 30 июля 1943 г. на ст.Осиповичи

Диверсионная операция на ст.Осиповичи, проведенная в ночь с 29 на 30 июля 1943 г. является, пожалуй: самой крупной боевой операцией, проведенной подпольщиками и партизанами на территории Белоруссии.

О ней упоминается в Ш томе Истории Великой Отечественной войны Советского Союза 1941-1945 /стр.480/ и там же дается оценка этой операции бывшим офицером Генерального штаба сухопутных войск Германии Миддейдорфом: "Крупного успеха добились партизаны также в июле 1943 г., когда ими на станции Осиповичи был уничтожен эшелон с горюче-смазочными материалами, два эшелона с боеприпасами и чрезвычайно ценный эшелон с танками "Тигр". Там же указывается, что эшелон с танками был очень ценным.

Около 30 новых танков "Тигр" - столько, сколько выпускала этих машин в то время вся танковая промышленность Германии за один месяц - было уничтожено подпольщиками и на фронт не пошло.

В силу ее значимости к ней проявляется большой интерес журналистов и бывших подпольщиков и партизан Минской зоны.

Так, в последние годы, в печати /в Осиповичской и Слуцкой районных газетах, "Неделя" № 31 за 1977 г./ стали появляться материалы освещающие эту операцию в искаженном виде: называются имена и действия которых не было, умалчиваются или неправильно описываются лица и организации, которые действительно готовили и проводили эту операцию в жизнь и т.д.

В июле 1943 г. я получил от Рабцевича 2 магнитные мины, котор[ые] Николаем Потоцким и Еленой Пармон были доставлены в Осиповичи и переданы Крыловичу /об этом есть запись в моем дневнике и другие материалы/, который в то время работал на станции Осиповичи электромонтером.

В очередной выход на дежурство, вечером 29 июля 1943 г. он подложил под эшелон с горючим две полученные мины, считая, что в течение часа эшелон уйдет со станции. Но эшелон был переведен на запасные пути /Могилевский парк/, где находилось еще несколько эшелонов. Туда же стали прибывать другие эшелоны. Приближалось расчетное время взрыва мины. Крылович, видя, что взрывы мин произойдут на станции, через Потоцкого и др. начал принимать меры к оповещению подпольщиков в депо и других местах о немедленном их выходе в лес. В эту же ночь Крылович так же ушел из Осипович в I-ю Бобруйскую партизанскую бригаду.

В результате 2 взрывов образовался пожар и было уничтожено на ст.Осиповичи 4 эшелона: 31 цистерна с горючими и смазочными материалами, 63 вагона со снарядами и авиабомбами, около 25 танков "Тигр"; 5 паровозов, крановая подача угля, блокпост и др.сооружения. Пожар и взрывы продолжались всю ночь и следующий день, а железнодорожный узел был выведен из строя на длительный срок.

Через несколько дней Крылович Ф.А. и многие подпольщики прибыли в расположение I-й Бобруйской партизанской бригады.

О проведенной диверсии командование бригады сообщило В.И. Козлову, а через его радио передало донесение в Белорусский штаб партизанского движения. Я доложил секретарю ЦК ЛКСМБ т.Мазурову К.Т. /докладная записка должна быть в архиве/. От имени ЦК ЛКСМБ т.Мазуров К.Т. через меня передал Крыловичу автомат с надписью от ЦК ЛКСМБ, а командованием бригады т.Крылович был представлен к званию Героя Советского Союза. За эту операцию Верховным Советом СССР т.Крылович был награжден орденом Ленина.

Бывший командир I-й Бобруйской партизанской бригады, Герой Советского Союза — В.ЛИВЕНЦЕВ

Бывший секретарь Могилевского подпольного обкома ЛКСМ, уполномоченный ЦК ЛКСМБ по зоне Осиповичи-Бобруйск — ГОЛОВИН

Бывшая подпольщица г.Осиповичи — Е.ПАРМОН /ПЕРЕВОЗЧИКОВА/

Пасля гэтай дыверсіі Ф. А. Крыловіч прыбыў у першую Бабруйскую партызанскую брыгаду. Разам з ім прыбылі яго таварышы Н. І. Патоцкі, А. М. Піскун, У. І. Ругалёў, А. Г. Вышынскі, В. М. Цімафеева. Крыловіч і Патоцкі былі залічаны ў групу далейшай разведкі. Неўзабаве Фёдар ўзначаліў разведавацельна-дыверсійную групу...

Крыловіч адначасова быў сябрам падпольнага Асіповіцкага райкама камсамола. Асноўнай яго задачай была праца на горад. Група Крыловіча знаходзілася ў ваколіцах Асіповічаў, падтрымліваючы цесную сувязь з падпольшчыкамі. Сумесна яны правялі шэраг дыверсій. Прывядзём ўсяго некалькі выпісак з архіўных дакументаў тых гадоў:

«... 7.IX.1943 па заданні Ф. Крыловіча Раманоўскі Леанід (падпольшчык) падарваў генератар чыгуначнай электрастанцыі ...

...У ноч з 15 на 16.IX.1943 (Патоцкі Н., Верашчагін Л., Крыловіч Ф.) на чыгуначнай станцыі Асіповічы ў мінскім парку цалкам знішчылі блокпост. З імі прыбылі сям'і партызан Патоцкага і Крыловіча. Яны ж прывезлі да 1 тоны солі і шмат паперы.

Да адной тоны солі! Хто перажыў жорсткія блакадныя баі той ведае яе сапраўдную цану...

«...5.XI.1943 – (Крыловіч, Патоцкі, Пармон Алена, Кургановіч) падарвалі трансфарматарны кіёск вагонарамонтнага пункта горада Асіповічы. Знішчаны цагляны будынак, трансфарматар, размеркавальны шчыт.

6. XI.1943 – знішчаны паравоз ў мінскім парку станцыі Асіповічы.

23.XI.1943 – на мінах, закладзеных Н. Патоцкім, ўзарваліся дзве легкавыя аўтамашыны...».

Спіс можна працягнуць.

Бацька Фёдара Крыловіча, Андрэй Андрэевіч, згодна ўзросту, здавалася, мог стаяць у баку ад актыўнай барацьбы з фашызмам. Аднак не так разважаў найстарэйшы чыгуначнік. Ён вельмі ўзрадаваўся, калі даведаўся, што ў лесе для падпольнай працы засталіся сакратары райкама партыі Р. Голант, А. Шыянок, старшыня райвыканкама М. Каралёў і што пад яго кіраўніцтвам дзейнічае партызанскі атрад. Крыловіч–старшы наладзіў сувязь з Асіповіцкімі падпольшчыкамі і актыўна ўключыўся ў барацьбу.

Ён захоўвае ў сваёй кватэры радыёпрыёмнік, атрымлівае звесткі і распаўсюджвае іх у горадзе, часта выходзіць на сувязь з партызанамі.

Пасля дыверсіі, выкананай сынам, Андрэй Андрэевіч са старым сябрам Іванам Кандратовічам Патоцкім, таксама пераходзяць у партызанскую брыгаду В. Лівенцава. Ды не з пустымі рукамі – ім удалося прывезці каля тоны солі і шмат паперы.

Падчас блакады Андрэя Андревіча параніла – асколкам варожай міны адбіла два пальцы правай рукі. Пасля вызвалення горада Асіповічы ён вярнуўся ў родную хату. На месцы дома сіратліва стаяла пачарнелая печ. У агародзе Андрэй Андрэевіч адкапаў калісьці акуратна схаваную сякеру. Гэта ўсё, што засталося ад былой гаспадаркі. Пачынаць трэба было ўсё спачатку. Аднак бацькава сэрца ныла ад болю, і ён адразу пачаў пошук, дзе загінулі яго двое дзяцей – Аляксей і Соф'я.

У Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі Рэспублікі Беларусь захаваліся лісты Андрэя Андрэевіча, у якіх ён звяртаецца з просьбай дапамагчы высветліць, дзе загінулі яго дзеці. У адным з лістоў ён пісаў: «Нягледзячы на свой пажылы ўзрост, я і мае трое дзяцей змагаліся на франтах, двое загінулі. Сам я і малодшы сын Фёдар вярнуліся з партызанскага атрада на папялішча. Немцы ўсю нашу маёмасць спалілі».

Пасля доўгіх пошукаў усё ж атрымалася высветліць лёс Аляксея і Соф'і Крыловіч. У час вайны Аляксей Крыловіч пайшоў у партызаны, быў камандзірам роты, узначальваў ўзвод разведкі. У характарыстыцы, падпісанай камандзірам партызанскай брыгады імя Фрунзе С. С. Ключко чытаем: «Крыловіч Аляксей Андрэевіч браў актыўны ўдзел ва ўсіх баявых аперацыях. Праявіў сябе дысцыплінаваным і адважным разведчыкам. 2 студзеня 1944 году ў баях з нямецка-фашысцкай захопнікамі на станцыі Негарэлае ён загінуў».



Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

ЦЕНТРАЛЬНЫЙ КОМИТЕТ КОММУНИСТИЧЕСКОЙ ПАРТИИ (большевиков) БЕЛОРУССИИ

П А Р Т А Р Х И В

25 сентября 1948 г.
№ 3972.

на В/№

ПРЕДСЕДАТЕЛЮ НОВОГРУДСКОГО ГОРИСПОЛКОМА

Бывш. командиру 18 бригады им. Фрунзе т. КЛЮЧКО

Копия: Гр-ну КРИЛОВИЧ А.А.

При этом направляю заявление и копию справки о принадлежности к партизанам КРИЛОВИЧ Алексея Андреевича и [illegible] Софии [illegible] жена КРИЛОВИЧ А.А. и [illegible] были партизанами и погибли, то необходимо заполнить на них личные листки по учету партизанских кадров и с подтверждением РК КП/б/Б /по [illegible] действия бригады/ выслать их в Партархив ЦК КП/б/ Белоруссии.

ПРИЛОЖЕНИЕ: заявление, справка и 2 личных листка по учету партизанских кадров, только первому адресату.

ЗАВ. ПАРТАРХИВОМ
ЦК КП/б/ БЕЛОРУССИИ /ПОПОВ/

Пра сястру Соф'ю ў архівах засталося яшчэ менш звестак. Такія людзі, як яна, звычайна тады не думалі пра дакументы. Аднак у памяці тых, хто дзякуючы ёй атрымаў прытулак і ежу ў страшным сорак першым годзе, хто з дапамогай Соф'і Крыловіч вырваўся з канцлагераў Мінска і Дзяржынска, вобраз гэтай цудоўнай жанчыны застанецца назаўсёды.

Халоднай студзенскай ноччу 1944 года ў дзверы яе дома злосна застукалі. Соф'я Андрэеўна толькі паспела схаваць у каморку сонных дзяцей – гэта было апошняе, што яна паспела зрабіць для іх. Яе расстралялі тут жа, на парозе хаты. Дзяцей падабралі суседзі, а потым іх забрала цётка Соф'і Андрэеўны – Алімпіяда Мікалаеўна Крыловіч. З вялікімі цяжкасцямі ёй удалося выкупіць дазвол на пахаванне пляменніцы. Адважная беларуская патрыётка была пахавана на могілках у вёсцы Розаўка Дзяржынскага раёна.

За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, Ф. А. Крыловіч быў адзначаны

вышэйшымі ўзнагародамі Радзімы – ордэнам Леніна і медаллю «Партызану Айчыннай вайны» І ступені.


ОТДЕЛ
ПО УЧЁТУ и РЕГИСТРАЦИИ НАГРАЖДЁННЫХ
при
секретариате Президиума Верховного
Совета БССР

10. XI 1949.
№ ЭН-5272

г. Осиповичи, Бобруйской обл.
Горбатовский пер. - 10
тов. Крыловичу Федору Андреевичу

Указом Президиума Верховного Совета СССР от 30 декабря 1948 года Вы награждены орденом Ленина

В связи с этим просим подтвердить точный адрес Вашего местожительства, а также сообщить о себе следующие данные: год и место рождения, в каком партизанском отряде находились, с какого времени и на какой должности.

После получения от Вас требуемых сведений, будет сообщено о месте вручения Вам награды.

Заведующий отделом (Ф. Тарасевич)

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!
Ордена Трудового Красного Знамени
Институт истории партии при ЦК КП Белоруссии —
филиал Института марксизма-ленинизма при ЦК КПСС
ПАРТАРХИВ

№ 2748 14 июня 1977 г.

Гр-ке КРЫЛОВИЧ С.Т.

АРХИВНАЯ СПРАВКА

КРЫЛОВИЧ Федор Андреевич, 1916 года рождения, с июля 1941 года по 30 июня 1943 года принимал активное участие в деятельности Осиповичского партийно-комсомольского подполья Могилевской области, с 30 июня 1943 года по июль 1944 года числится партизаном отряда № 752 1-й Бобруйской партизанской бригады указанной области в должностях рядового и командира диверсионной группы.

Архивная справка составлена по материалам партархива.

ЗАВ.СЕКТОРОМ ПАРТАРХИВА ИНСТИТУТА
ИСТОРИИ ПАРТИИ ПРИ ЦК КПБ (Л.АРЫЛЕВА)

М-I

ПОСТУПИЛО 20 ... 194 г.

# НАГРАДНОЙ ЛИСТ

1. Фамилия, имя и отчество *Крылович, Федор Андреевич*

2. Звание *Сержант* 3. Должность, часть *Разведчик ББ партизанского отряда, 1-й Бобруйской п/бригады Ливенцева*

Представляется к *награде медалью «Партизану Отечественной войны» I степени.*

4. Год рождения *1916* 5. Национальность *Белорус* 6. Партийность *чл. ВЛКСМ*

7. Участие в гражданской войне, последующих боевых действиях по защите СССР и отечественной войне (где, когда) *с 29.6 по 5.8.39 г. - в борьбе с японскими самураями на р. Халхин-Гол; с 24.12.39 г. по 13.3.40 г. - в борьбе с белофиннами. В Отечественной войне: Июнь-Июль 1941 г. Зап. фронт; с Января 1942 г. в партизанах Белоруссии*

8. Имеет ли ранения и контузии в отечественной войне *Нет.*

9. С какого времени в Красной Армии *с 1938 года*

10. С какого времени в партизанском отряде *с Января 1942 г.*

11. Чем ранее награжден (за какие отличия и когда) *Наград не имеет.*

12. Постоянный домашний адрес представляемого к награждению и адрес его семьи *БССР, г. Осиповичи, Горбатовский пер. 10.*

---

1. Краткое конкретное изложение личного боевого подвига или заслуг

---

*Оставшись в тылу у противника в гор. Осиповичи принимает активное участие в Отечественной войне. - руководит подпольной работой одной из групп. Через свою группу в отряд доставляет ценные сведения о противнике, из немецких складов в отряд вывозит бумагу, соль, крупу, медикаменты и др. В городе распространял советские и партизанские листовки, газеты и проч. литературу. В конце июля 1943 г. по заданию командования бригады в гор. Осиповичи совершил крупную диверсию - уничтожил 4 эшелона противника с авиабомбами, горючим, снарядами, танками, автомашинами и вышел в отряд.*

*В отряде организовал группу, снова умело обойдя посты охраны пр-ка пробрался в город со своей группой и взорвал блок-пост - вывел из строя 250 стрелок Могилевского парка ст. Осиповичи, взорвал семафор, взорвал суконно-ремонтный завод.*

*Смелый и решительный партизан.*

*Достоин награды медали «Партизану Отечественной войны» I степени.*

Камандир 1-й Бобруйской партизанской бригады — Полковник ЛИВЕНЦЕВ.

Комиссар бригады — Капитан ЛЕПЕШКИН.

Начальник штаба бригады — Старший лейтенант КРЕМНЕВ.

*29 ноября* 1943 г.

Пасля заканчэння вайны Фёдар Крыловіч жыў і працаваў у родным горадзе. На той жа станцыі, на той жа пасадзе электрыка. Пастаянна адкрываліся раны ад куль і асколкаў. Але больш за ўсё мучылі наступствы хранічных кантузій. Гэта страшная хвароба падрыўнікоў: спазмы сасудаў, страшныя галаўныя болі. Аднак Фёдар Крыловіч прывык працаваць добрасумленна. Пра гэта сведчыць вытворчая характарыстыка:


Производственная характеристика

Крылович Ф.А. работает электромонтером с сентября 1945 г. а позже за хорошую работу переведен в ст. электромонтеры.
За период работы на электростанции т. Крылович Ф.А. все задания выполнял и перевыполнял. Является ударником. За хорошую работу получил благодарность от руководства отделения Паровозного хозяйства.
За перевыполнение производственных задан. отмечался прессой, так „Железнодорожник Белоруссии" в небольшом номере отметил [illegible] станции. Так же областная газета „Советскую родину" отметила этот [illegible]
Крылович Ф.А. является профоргом [illegible] электростанции. Активно участвует в общественно-политической жизни электростанции и отделения паровозного хозяйства. Решением Райпрофсожа т. Крылович Ф.А. занесен на доску почета [illegible] Октябрьской революции.

Начальник электростанции [illegible]

[illegible].1947.




У 1959 годзе Ф. А. Крыловіча не стала.

У памяць аб адважным патрыёце адна з вуліц Асіповічаў носіць яго імя.

Копия

**ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ОСИПОВИЧСКОГО ГОРОДСКОГО СОВЕТА НАРОДНЫХ ДЕПУТАТОВ**

**РЕШЕНИЕ № 21-9**

27 апреля 1978 г. г. Осиповичи

Об увековечении памяти прославленного партизана и подпольщика тов. КРЫЛОВИЧА Фёдора Андреевича

В соответствии с постановлением Осиповичского ГК КПБ от 24 апреля 1978 г. "Об увековечении памяти прославленного партизана и подпольщика тов. КРЫЛОВИЧА Ф.А." исполнительный комитет Осиповичского городского Совета народных депутатов

**Р Е Ш И Л:**

I. Переименовать ул. Новопроектную в ул. имени Крыловича Ф.А.

2. Обязать комбинат коммунальных предприятий (начальник тов. Коган А.Л.) до I июля 1978 года:

- изготовить и установить мемориальные доски на одном из домов улицы им. Крыловича Ф.А. и на здании железнодорожного вокзала;
- изготовить и установить обелиск на могиле тов. Крыловича Ф.А. на городском кладбище, привести в порядок могилы его отца, сестры.

3. Предоставить семье тов. Крыловича Ф.А. квартиру в строящемся жилом доме по ул. [illegible] в соответствии с санитарными нормами.

п.п. Председатель исполкома Осиповичского городского Совета народных депутатов -подпись-
В.Ковалёв

п.п. Секретарь исполкома Осиповичского городского Совета народных депутатов -подпись-
В.Новикова

Копия верна:

У 1994 годзе на базе СШ №2 створаны музей гісторыі школы, у якім ўвекавечана памяць пра Фёдара Андрэевіча Крыловіча. Сярод экспазіцый музея знаходзіцца панарама подзвігу Ф. А. Крыловіча. Матэрыялы пра яго экспануюцца ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. 2 ліпеня 2009 года на прывакзальнай плошчы г. Асіповічы адкрыты помнік Фёдару Крыловічу.



Героі Вялікай Айчыннай вайны, у шэрагу якіх стаіць і імя Ф. А. Крыловіча, вечна будуць жыць у святой памяці народа.

## Літаратура

Крылович Федор Андреевич // Республика Беларусь : энциклопедия / редактор Г. П. Пашков. — Минск, 2007. — Т. 4. — С. 325.

Не давали покоя врагу! / Каминский, В. Д. Без права на славу / В. Д. Каминский. — Могилев, 2005. — С. 109—111.

Фёдар Крыловіч – супердыверсант // Памяць. Асіповіцкі раён. — Мінск, 2002. — С. 280—281.

Зорын, У. Выбух у начы / У. Зорын // Запаветы Леніна. — 1994. — № 48. — 29 чэрвеня. — С. 2—3.

Головко, С. Рубежи [Электронный ресурс] // Память нужна живым. Хроника победы : сайт. — Режим доступа: https://peramoga.belta.by/ru/Rubeji/

Егоров, А. Подвиг Фёдора Крыловича / А. Егоров // Железнодорожник Беларуси. — 1996. — 15 февраля. — С. 3.

Каминский, В. Герои славою сочтутся / В. Каминский // Могилёвская правда. — 1999. — 20 марта. — С. 9.

Ковалёв, В. Супердиверсант второй мировой / В. Ковалёв // Во славу Родины. — 1999. — 3 февраля. — С. 2.

Крапивин, С. Супердиверсия / С. Крапивин // Советская Белоруссия. — 1998. — 8 мая. — С. 6—7.

Крапивин, С. Диверсия Крыловича / С. Крапивин // Труд-7. — 2003. — 31 июля (№ 139). — С. 1.

Крылович Ф. А. – организатор Осиповичского подполья // Их именами названы... : энциклопедический справочник. — Минск, 1987. — С. 327—328.

Лавренюк, В. Осиповичская диверсия / Владимир Лавренюк // Белорусская военная газета. — 2009. — 13 августа. — С. 3.

Лесникова, Т. Диверсия Крыловича / Татьяна Лесникова // Железнодорожник Белоруссии. — 2009. — 22 июля. — С. 11.

Літвін, А. Зарыва над станцыяй / А. Літвін // Беларусь. — 1981. — № 5. — С. 16—18.

Мартынов, И. «Тигры» до Курска не дошли / Иван Мартынов // Могилевская правда. — 2007. — 16 марта. — С. 18.

Мартынов, И. «Тигры» до Курска не дошли / Иван Мартынов // Асіповіцкі край. — 2007. — 26 чэрвеня.

Мироненко, В. Н. Звезда Крыловича / В. Н. Мироненко. — Минск : ВА РБ, 2015. — 24 с.

Парсаданаў, У. Партызан з легенды / У. Пасаданаў, Ф. Лук'янчык // Запаветы Леніны. — 1991. — 31 жніўня.

Попова, Ю. Федор Крылович: как партизан взорвал сразу 4 немецких эшелона [Электронный ресурс] // Русская семерка : сайт. — Режим доступа: https://russian7.ru/post/fedor-krylovich-kak-partizan-vzorval-z/

Соболевский, А. Супердиверсант Федор Крылович / А. Соболевский // Во славу Родины. — 2006. — 24 января. — С. 2.

Славинский, Ф. Диверсия на узловой станции / Ф. Славинский // Магілёўскія ведамасці. — 1999. — 2ліпеня. — С. 2.

Федор Крылович // Архівы і справаводства. — 2009. — № 3. — С. 159.

Филонов, В. Герой и подвиг, или одна ночь «рельсовой войны» / В. Филонов // Бобруйский курьер. — 1998. — 23 июля.